**ВОДЗЫЎ**

афіцыйнага апанента кандыдата філалагічных навук, дацэнта
Бурдзялёвай Ірыны Аляксееўны на дысертацыю
Косцінай Жанны Вячаславаўны «Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя»,
прадстаўленую да абароны на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

**Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасцям і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны.**

Змест дысертацыйнага даследавання Жанны Вячаславаўны Косцінай «Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя», методыка вывучэння фактычнага матэрыялу даюць падставы заключыць, што гэта навуковая праца адпавядае спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура, а таксама асноўным патрабаванням да кандыдацкіх дысертацый у галіне літаратуразнаўства, па якой яна прадстаўлена да абароны.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

Увага да літаратурнай сітуацыі Беларусі першай паловы XIX стагоддзя як вытоку новай літаратуры з яе дамінантнымі ідэалагічнымі і эстэтычнымі прынцыпамі, як пачатковага перыяду станаўлення беларускай мастацкай традыцыі, цалкам адпавядае актуальным кірункам сучаснага літаратуразнаўства. Нягледзячы на даволі вялікую колькасць навуковых прац, прысвечаных розным аспектам літаратурнага развіцця XIX стагоддзя, па-ранейшаму запатрабаванымі застаюцца даследаванні абагульняючага характару, якія на аснове сукупных мастацкіх з'яў даюць магчымасць вылучыць характэрныя для цэлага літаратурнага перыяду тыпалагічна агульныя тэндэнцыі, адзначыць эстэтыка-аксіялагічныя пошукі літаратуры.

Актуальнасць даследавання Ж. В. Косцінай тлумачыцца неабходнасцю разгляду літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя як цэласнага ў сваёй ідэйна-мастацкай скіраванасці працэсу. Дзеля комплекснага аналізу асноўных тэндэнцый літаратурнага развіцця яна звярнулася да вывучэння эстэтычнага ідэалу гэтага перыяду – галоўнай ацэначнай катэгорыі эстэтычнай свядомасці, асаблівасцей яго выспявання і мастацкага ўвасаблення на пачатковым этапе станаўлення новай беларускай літаратуры як самастойнай эстэтычнай з'явы.

Важнасць даследавання абумоўлена асаблівай значнасцю эстэтычнага ідэалу ў сістэме вядучых катэгорый эстэтыкі, дзе ён з'яўляецца адначасова вышэйшым крытэрыем прыгожага і належнага ў мастацтве, і формай светапогляду. Таму эстэтычны ідэал ёсць, па-сутнасці, разуменнем грамадствам і самімі пісьменнікамі аксіялогіі літаратуры, яе мастацкіх мэт, задач і сродкаў іх дасягнення. Ён выступае як асноўная катэгорыя разгляду мастацкага твора і літаратурнага працэсу ў цэлым, мае канкрэтнае ўвасабленне ў творчасці асобнага аўтара і, разам з тым, акумулюе эстэтычную практыку цэлага этапа літаратурнага развіцця. Такім чынам, эстэтычны ідэал дае аб'ектыўнае абагульненне эстэтычнай практыкі як асобнага творцы, так і літаратуры за значны перыяд.

Прапанаванае дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца актуальнай працай, якая на аснове вывучэння і абагульнення разнастайных літаратурна-мастацкіх працэсаў і з'яў дазваляе вылучыць вызначальныя філасофскія, маральна-этычныя і эстэтычныя прынцыпы, якія фарміравалі спецыфіку літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, і абумовілі шляхі яе далейшага развіцця.

**Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону.**

Навуковая праца Ж. В. Косцінай адносіцца да ліку міждысцыплінарных даследаванняў, праведзеных на мяжы філасофіі, эстэтыкі і літаратуразнаўства.

Варта адзначыць, што саіскальніца абрала вельмі няпростую тэму для дысертацыі, таму што эстэтычны ідэал – складаная, шматкампанентная катэгорыя эстэтыкі, якая разглядаецца ў тэарэтычным і метадалагічным плане, мае на ўвазе канцэптуальна-аксіялагічны ўзровень літаратуры і яго мастацкае праяўленне ў творах.

Складанасць абумоўлена і значнай колькасцю навуковых публікацый па літаратуры першай паловы XIX стагоддзя, і даследаванасцю шэрагу хрэстаматыйных аўтараў, да якіх звяртаецца Ж. В. Косціна, але яна, сінтэзуючы вопыт навуковых папярэднікаў, прапанавала сваю стратэгію вывучэння літаратурнага працэсу гэтага часу, вызначаную галоўнай мэтай і задачамі даследавання. Яна заключаецца ў комплексным разглядзе эстэтычнага ідэалу ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя ва ўсёй сукупнасці яго ідэйна-змястоўных і фармальных параметраў і асаблівасцях іх «матэрыялізацыі» ў канкрэтнай творчай практыцы пісьменнікаў.

Апрача мастацкіх твораў, дадатковай базай даследавання з'явіліся крытычныя і публіцыстычныя працы пісьменнікаў XIX стагоддзя, у якіх акрэсліваюцца аксіялагічныя і эстэтычныя прыярытэты як уласнай творасці, так і патрабаванні да мастацкай літаратуры ў цэлым, што значна пашырыла магчымасці аналізу эстэтычнай парадыгмы тагачаснай літаратуры.

Навуковую значнасць мае разгляд рамантычнай іроніі як асаблівага тыпу мастацкага мыслення, народжанага рамантычнай канцэпцыяй двусвецця, і яе праяўленне ў тагачаснай мастацкай літаратуры Беларусі. У дысертацыі разгледжаны ўплыў рамантычнай іроніі на канцэптуальны ўзровень твораў і асаблівасці іх кампазіцыйнай будовы.

Да істотных дасягненняў даследавання варта аднесці разгляд аксіялагічных складнікаў эстэтычнага ідэалу, вызначаных хрысціянскім светапоглядам і ацэначнымі катэгорыямі народнай маралі; эстэтызацыю катэгорый праўды і патрыятызму як найвышэйшых маральна-этычных каштоўнасцей; актуалізацыю народнага і нацыянальнага як эстэтычных складнікаў тэксту; арыентацыю на мастацкія каштоўнасці фальклору, што надавала эстэтычнаму ідэалу адметна нацыянальную спецыфіку.

Асобныя раздзелы дысертацыі прысвечаны ролі эмоцыі і рэфлексіі ў стварэнні сэнсава-змястоўнага напаўнення твора, сімвалізацыі слова-вобраза, які генетычна паходзіць з народных уяўленняў, выпрацоўцы літаратурай жанравых форм адлюстравання нацыянальнага жыцця.

Такім чынам, у беларускім літаратуразнаўстве ўпершыню праведзены ўсебаковы аналіз змястоўнасці эстэтычнага ідэалу і яго разнастайная рэпрэзентацыя ў мастацкіх творах. Вынікі, атрыманыя ў ходзе даследавання, дазваляюць асэнсаваць літаратурны працэс на новым узроўні, з канкрэтызацыяй яго аксіялагічных і эстэтычных параметраў, што ўдакладняе і дапаўняе ўяўленні пра літаратурную сітуацыю Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.**

Асноўныя высновы і рэкамендацыі, сфармуляваныя ў дысертацыі, дасягнуты шляхам абагульнення і ўдакладнення асобных палажэнняў, выказаных ў навукова-даследчыцкіх працах беларускіх і замежных філосафаў і літаратуразнаўцаў, а таксама на аснове ўласнай стратэгіі вывучэння і інтэрпрэтацыі твораў першай паловы XIX стагоддзя. Дастатковы аб'ём прааналізаванага матэрыялу і прадуманая даследчыцкая стратэгія, а таксама правільна абраная метадалогія дазваляюць меркаваць пра аргументаванасць і доказнасць высноў. Важна, што даследчыцай на глебе сістэматызацыі, абагульнення і дапаўнення існуючых ведаў прасочаны працэс фарміравання і зацвярджэння эстэтычнага ідэалу ў тагачаснай літаратуры Беларусі, вызначана яго аксіялагічнае напаўненне і асаблівасці ўвасаблення ў канкрэтна-пачуццёвых вобразах.

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання апрабаваны на 16 рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях.

**Навуковая, практычная, сацыяльная і эканамічная значнасць вынікаў дысертацыі, з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

Навуковая значнасць вынікаў даследавання заключаецца ў тым, што яны садзейнічаюць узбагачэнню навуковых ведаў пра літаратурны працэс Беларусі XIX стагоддзя, выспявання ў ім найвышэйшых каштоўнасных і эстэтычных арыенціраў, што адбывалася як следства ўнутрылітаратурных эвалюцыйных працэсаў на аснове мастацкага вопыту і дасягненняў усяго папярэдняга літаратурнага развіцця, пад уплывам айчыннай і заходнееўрапейскай філасофска-эстэтычнай думкі, а таксама ў выніку ўсведамлення пісьменнікамі ідэйна-мастацкіх прынцыпаў новай літаратуры.

Высновы дысертацыі спрыяюць больш поўнаму разуменню развіцця літаратуры Беларусі ў рэчышчы агульнаеўрапейскіх літаратурна-мастацкіх зрухаў, перадрамантычнага пералому, калі нараджаўся новы светапогляд, сцвярджаліся і атрымлівалі мастацкае ўвасабленне ідэйна-творчыя пазіцыі

рамантызму. Вызначаныя ў складзе эстэтычнага ідэалу беларускай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя змястоўна-каштоўнасныя і эстэтычныя прынцыпы дапамагаюць глыбей разумець асаблівасці яе далейшага паступальнага развіцця.

Вынікі даследвання маюць і сацыяльную значнасць, таму што эстэтычны ідэал з'яўляецца галоўным крытэрыем прыгожага і належнага ў літаратуры і ў жыцці. Пісьменнік і чытач увасабляе і ўспрымае з'явы рэчаіснасці ў святле эстэтычнага ідэалу – галоўнай ацэначнай катэгорыі.

Практычная значнасць даследавання заключаецца ў тым, што яе вынікі могуць быць выкарыстаны пры стварэнні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для ВНУ і сярэдніх навучальных устаноў, пры правядзенні практычных і семінарскіх заняткаў, пры напісанні курсавых, дыпломных, магістарскіх работ адпаведнага кірунку. Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць стаць асновай для распрацоўкі спецкурсаў і спецсемінараў па гісторыі беларускай літаратуры, па літаратуры рамантызму.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.**

Змест працы, яе канцэпцыя і асноўныя палажэнні лагічна і абгрунтавана перададзены ў аўтарэфераце, а таксама адлюстраваны ў 28 публікацыях: 8 артыкулаў у навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (3,56 аўт. арк.), 4 у зборніках навуковых артыкулаў (1,31 аўт. арк.), 16 – матэрыялы навуковых канферэнцый (4,11 аўт. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 8,98 аўтарскіх аркушаў.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.**

Афармленне дысертацыі ў цэлым, асобных яе частак і аўтарэферата адпавядае патрабаванням Інструкцыі па афармленню дысертацыі і аўтарэферата.

**Заўвагі.**

1. Паняцце рамантычнай іроніі экстрапалюецца на творы, дзе яе прысутнасць вельмі сумнiўная. Так, у якасці аднаго з прыкладаў рамантычнай іроніі абрана парадыйна-сатырычная паэма «Энеіда навыварат». Варта адзначыць, што не ўсякая іронія з'яўляецца рамантычнай іроніяй. Як справядліва адзначае даследчыца, рамантычная іронія народжана рамантычнай канцэпцыяй двусвецця. Так, але рамантычная іронія пры гэтым мае на ўвазе гульню з аб'ектыўным светам, іронію аўтара над самім сабой і ўяўнай ілюзіяй уласнага разумення свету, які для рамантыкаў бясконцы, рухомы і непазнавальны. У іранічнай іроніі ўвасоблена дыялектыка рамантызму як светапогляднай сістэмы. Гэта сцверджанне нечага і тут жа яго адмаўленне, у выніку чаго адбываецца змена сэнсу на супрацьлеглы, нараджэнне новых сэнсаў. Ці ёсць гэта ў «Энеідзе навыварат»? І хаця беларуская «Энеіда» храналагічна замыкае шэраг еўрапейскіх парадыйных

твораў падобнага кшталту, і ў ёй ёсць мноства тагачасных рэалій беларускага жыцця, гэта найперш травесційны, бурлескны твор, які прадзірує высокі жанр і пафаснага героя класіцызму. Ён хутчэй народжаны еўрапейскай літаратурнай традыцыяй папярэдняй эпохі.

Тое ж самае варта адзначыць і адносна аповесці Ганны Мастоўскай «Не заўсёды так робіцца, як гаворыцца», у якім, на думку даследчыцы, рамантычная іронія як тып мастацкага мыслення рэалізавалася ў псеўдападыходе да гісторыі. Аповесць надрукавана ў зборніку «Moje rozrywki» ў 1806 годзе, то бок у пераходны перыяд, калі пра рамантызм весці гаворку зарана. Твор напісаны ў адпаведнасці з тагачаснай літаратурнай традыцыяй і мастацкім густам.

Эстэтычны ідэал у першай палове XIX стагоддзя фарміруецца менавіта як *рамантычны* эстэтычны ідэал, але варта памятаць, што асабліва ў першых яго дзесяцігоддзях прысутнічаюць і іншыя мастацкія з'явы, абумоўленыя іншым светапоглядам, не толькі рамантычным, што і складае інтрыгу развіцця літаратуры і вылучэння ў ёй вядучай перспектыўнай мастацкай плыні.

2. Нельга пагадзіцца з аналізам вобраза пана Завальні з кнігі Я. Баршчэўскага як вобраза, афарбаванага рамантычнай іроніяй, і трактоўкай героя як кансерватара, бязвольнага чалавека, які вядзе панылае прагматычнае жыццё. Так, Завальня кансерватар, але гэта кансерватызм іншага кшталту. Гэта абарона традыцыйнай народнай маралі, хрысціянскіх каштоўнасцяў, забытых і занядбаных у сучасным яму свеце, ад якога ён імкнецца сябе адмежаваць. Тут прыведзены ў дысертацыі разгляд этымалогіі прозвішча героя вельмі дарэчы.

3. Некаторыя палажэнні, якія сцвярджаюцца ў Вывадах і Заключэнні, не атрымалі належнай аргументацыі ў адпаведных раздзелах.

Дастаткова фрагментарным выглядае раздзел 4.2 «Эстэтычнае мадэляванне зместу літаратуры Беларусі ў вытокавы перыяд», прысвечаны жанравым асаблівасцям літаратуры адпаведнага перыяду, у якім у асноўным разглядаецца літаратурная адаптацыя фальклорных жанраў калыханкі і казкі. Але ў Вывадах, апрача высноў, атрыманых у выніку аналізу аўтарскай апрацоўкі гэтых жанраў, сцвярджаецца: «У драматургічным мастацтве Беларусі першай паловы XIX стагоддзя адбываецца дэкананізацыі (рамантызацыя) класікі, калі аўтарскі (суб'ектыўны) элемент дае ацэнкі рэчаіснасці і выкарыстоўвае формы не толькі драматычнага, але і эпічнага і лірычнага пісьма. У эстэтычнай камунікацыі герояў п'ес і гледачоў узнікае аўтарскае «я», не тоеснае цэнтральным персанажам (Я. Чачот, А. Міцкевіч, В. Дунін-Марцінкевіч)» ( с. 109). Пры гэтым падобныя сцверджанні не былі належным чынам разгледжаны і абаснаваны ў раздзеле.

Гэтаксама ў Заключэнні (с. 114) канстатуецца ўвага тагачасных аўтараў да локусу кургана, але ў адпаведным раздзеле аналіз выкарыстання гэтага вобраза і яго семантыкі адсутнічаюць. Ёсць разгляд сімволікі гары, але гара і курган – гэта розныя вобразы, якія маюць адрозны сэнс.

4. У даследаванні не хапае цытацыі польскамоўных тэкстаў і спасылак на польскамоўныя крытычныя і літаратуразнаўчыя працы, тым больш, што ў дысертацыі неаднаразова падкрэсліваецца білінгвальны характар літаратуры Беларусі, дзе польская мова, асабліва ў першай палове XIX стагоддзя, была вядучай мовай літаратуры.

5. Вельмі катэгарычным бачыцца сцверджанне: «Беларускамоўная літаратура Беларусі першай паловы XIX стагоддзя ў эмацыянальным плане адрозніваецца ад польскамоўнай. Яна вызначаецца дамінуючай эмоцыяй радасці» (с. 84). Насамрэч эмацыянальны спектр беларускамоўнай літаратуры значна шырэйшы, калі ўспомніць беларускамоўныя творы Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, А. Рыпінскага, Г. Марцінкевіча, Ф. Савіча, А. Плуга. Беларускамоўнасць твораў мела розныя функцыі і адпаведна эмацыянальнае насычэнне твораў было розным.

6. Таксама ў дысертацыі прысутнічаюць некарэктныя фармулёўкі. Напрыклад, на с. 112: «Абсалютнай каштоўнасцю для селяніна з'яўляецца праца, якая пазбаўляе чалавека агрэсіўнасці, робіць яго цярплівым, памяркоўным. Аднак гэтыя якасці характару вельмі часта мяжуюць з абыякавасцю і сацыяльнай апатыяй, што, у сваю чаргу, вядзе да п'янства, якое ў творчасці вышэй пералічаных аўтараў служыць аб'ектам выкрыцця». Праца заўсёды была сакральнай тэмай беларускай літаратуры, яна ўзвышала чалавека, а не «пазбаўляла агрэсіўнасці» як нейкая выхаваўчая карная мера. І не праца была прычынай сацыяльнай апатыі і п'янства.

Выказаныя заўвагі ў большасці носяць дыскусійны характар і не змяншаюць навуковай значнасці дысертацыйнай працы.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Навуковы характар дысертацыі, выкарыстаныя метады і прыёмы аналізу фактычнага матэрыялу, назіранні і вывады, якія лагічна падаюцца ў працэсе даследавання эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, даюць падставы заключыць, што Ж. В. Косціна адпавядае навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура.

**Высновы:**

Такім чынам, дысертацыя Жанны Вячаславаўны Косцінай «Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя», падрыхтаваная пад навуковым кіраўніцтвам доктара філалагічных навук, прафесара Івана Васільевіча Саверчанкі, з'яўляецца кваліфікаваным навуковым даследаваннем і цалкам адпавядае патрабаванням п. 19–20 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь» і профілю Савета па абароне дысертацый Д 01.42.04 пры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай

акадэміі навук Беларусі» па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура, а яе аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук ЗА:

– сістэмна-комплекснае даследаванне фарміравання і мастацкага выяўлення эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, вызначэння і канкрэтызацыі яго аксіялагічных і эстэтычных прынцыпаў, якія заклалі аснову перспектыўнага развіцця нацыянальнай літаратуры;

– раскрыццё спецыфікі мастацкай рэалізацыі ідэйна-змястоўных і фармальных складнікаў эстэтычнага ідэалу на розных узроўнях літаратурнага твора, сцвярджэння тым самым нацыянальнай адметнасці эстэтычнага ідэалу, абумоўленай культурным, сацыяльна-гістарычным кантэкстам і народнай маральна-эстэтычнай канцэпцыяй чалавечага быцця;

– вылучэнне ролі іроніі ў мастацкім адлюстраванні свету літаратурай беларускага рамантызму і даследаванне яе праяўлення на канцэптуальным і кампазіцыйным узроўнях твора;

– аналітычнае асвятленне знакава-сімвалічнай вобразнасці як складніку эстэтычнага ідэалу, сімвалізацыі прэцэдэнтных локусаў і флоравобразаў – увасабленняў нацыянальных і народных этычна-эстэтычных паняццяў, ацэначнай і сэнсаўтваральный ролі эмоцый;

– разгляд літаратурнай адаптацыі фальклорных жанраў калыханкі і казкі з улікам іх аксіялагічнай значнасці і аўтарскай задумы пісьменніка.

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт, дацэнт кафедры
беларускай філалогіі і замежнай літаратуры,
УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» І.А. Бурдзялёва

14.01.2025.

Учреждение образования
"МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
ЛИНГВИСТИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ"
Подпись Бурдзелевой И.А.
УДОСТОВЕРЯЮ
... отдела кадров МГЛУ
(П.П. Новиков)
14 01 2025 г.



Паступіў у савет
14.01.2025г.
вуч. сакратар (А.У. Бозан)

Азнаёмлена 22.01.2025